*Ю.Ю.Захарына, канд. мастац., выкладчык каф. этналогіі і фальк. БГПУ (г.Мінск)*

# СТАНАЎЛЕННЕ МАСТАЦКАГА ВОБРАЗА Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ ГОРАДАБУДАЎНІЦТВЕ: АГУЛЬНАТЭАРЭТЫЧНЫ АСПЕКТ

У станаўленні мастацкага вобраза сучаснай беларускай архітэктуры важнае значэнне набылі горадабудаўнічыя вырашэнні. Пры гэтым дакладнага размежавання традыцыйных і наватарскіх ідэй у горадабудаўнічай практыцы рэспублікі 1970–90-х г. не існуе. Многія нацыянальныя традыцыі горадабудаўнічай дзейнасці знаходзяць працяг у вызначэнні планіровачнай структуры гарадоў і іх забудове, архітэктары прытрымліваюцца склаўшыхся гістарычна прынцыпаў і прыёмаў арганізацыі прасторы і імкнуцца ў пераасэнсаваным выглядзе адрадзіць лепшыя дасягненні мінулага.

Істотную ролю ў фарміраванні мастацкага вобраза сучасных гарадоў Беларусі адыграла пытанне аховы помнікаў гісторыі і культуры і звязанае з ім пытанне рэканструкцыі і рэстаўрацыі. Вялікае значэнне для аховы помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны аказала юрыдычнае рэгуляванне дзейнасці па зберажэнню культурных каштоўнасцяў, якое здзяйсняецца на міжнародным (нарматыўныя дакументы ЮНЕСКА, ІКАМОС) і рэспубліканскім (сістэма нарматыўных актаў, замацаваных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Крымінальным кодэксе, Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях, а таксама ў шэрагу Законаў Рэспублікі Беларусь: «Аб культуры», 1991, «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», 1992, «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», 1998, «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь», 1996, «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь», 1995, «Аб нацыянальным архіўным фондзе і архівах у Рэспубліцы Беларусь», 1994) узроўнях. Аднак вялікая колькасць нарматыўных дакументаў па ахове помнікаў гісторыі і культуры выклікала шэраг праблем: першыя – тэарэтычныя, звязаныя з вызначэннем ключавых тэрмінаў («культурныя каштоўнасці», «мастацкія каштоўнасці», «гісторыка-культурныя каштоўнасці», «помнікі гісторыі і культуры», «архітэктурныя помнікі»), другія – практычныя, звязаныя з усталяваннем межаў зон аховы помнікаў гісторыі і культуры. Пры гэтым у межах пытання занальнага размежавання ахоўных тэрыторый вызначылася 4 асноўныя тыпы: ахоўная зона, зона рэгулюемай забудовы, зона аховы прыроднага наваколля, зона аховы культурнага слоя, адрозненні паміж якімі

заключаюцца у рэжымах утрымання помнікау і рэгламентацып новага будаунцтва у іх межах.

Сярод аспектау фарміравання мастацкага вобраза сучаснай архітэктуры Беларусі вялікую каштоунасць уяуляюць гістарычныя цэнтры гарадоу, якія ахоуваюцца у адпаведнасці з заканадауствам краіны. Дзяржауны спіс гісторыка-культурных каштоунасцяу Беларусі налічвае 9 гістарычных цэнтрау гарадоу, у якіх засяроджаны найбольш буйныя і яскравыя горадабудаунічыя помнікі Беларусі (Мінск, Гродна, Навагрудак, Брэст, Пінск, Кобрын, Віцебск, Полацк, Магілёу). У Спіс сусветнай спадчыны пры гэтым уваходзяць толькі 2 помнікі гісторыі і культуры – Белавежская пушча і Мірскі замак.

Актыуную ролю у станауленні мастацкага вобраза адыграла далейшае развіцце грамадскіх цэнтрау гарадоу. Цэнтр горада з'яуляецца яго планіровачным ядром; тут засяроджаны асноуныя культурна-палітычныя і сацыяльныя архітэктурныя аб'екты, а таксама гістарычная забудова (плошча Свабоды і Траецкае прадмесце у Мінску, плошча Свабоды у Віцебску, Лідская крэпасць, мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць» у Брэсце і інш.). Цэнтры гарадоу насычаны транспартам, што пагаршае экалагічнае становішча і пагражае бяспецы пешаходау, таму існуе праблема іх разгрузкі ад аутатранспартнага руху. У 1970 – 90-я гг. у Беларусі галоуным прынцыпам вырашэння дадзенай праблемы стала арганізацыя пешаходных зон (вуліц, плошчау, цэнтрау-эспланад і г.д.), якая здзяйснялася па двух асноуных накірунках: стварэнне новых пешаходных зон (вул. Чапаева у Лідзе, праспект Машэрава у Мінску і інш.) і пераутварэнне аутатранспартных дарог у пешаходныя (вул. Савецкая у Гродне, вул. Савецкая у Брэсце). Вырашэнне пастауленага пытання у многім спрыяла і захаванню каштоунай гістарычнай забудовы.

Пад уплывам гістарычных традыцый складваецца архітэктурна-планіровачная структура гарадоу, асноуны прынцып кампазіцыі якой фарміруе грамадскі цэнтр. Пад уплывам склаушайся гістарычнай забудовы, а таксама асаблівасцяу прыродна-ландшафтных умоу у Беларусі вызначыліся адрозненні у планіровачнай структуры цэнтрау вялікіх і малых гарадоу. Малыя гарады узялі за аснову развіцця монацэнтрычныя кампактныя кампазіцыі грамадскіх цэнтрау; вялікія і буйныя – поліцэнтрычныя лінейна-восевыя кампазіцыі, якія знаходзяць працяг на перспектыву у зорчатай (Мінск, Гомель, Віцебск) ці веернай (Брэст, Пінск) структуры цэнтрау планіровачных раёнау. Актыуным сродкам фарміравання мастацкага вобраза цэнтрау гарадоу стала выкарыстанне прыродна-ландшафтных умоу. У выніку вызначылася характэрная рыса мастацкай кампазіцыі – моцная сувязь цэнтрау гарадоу з водна-зялёным дыяметрам.

У фарміраванні планіровачнай структуры гарадоў найбольшае значэнне атрымаў прыродна-ландшафтны фактар. Кампазіцыйную вось асабліва буйных гарадоў утварае водна-зялёны дыяметр (тэрыторыі вакол р. Свіслач у Мінску, р.Сож у Гомелі, р.Дубровенка і р.Дзебра у Магілёве, р. Заходняя Дзвіна у Віцебску, р.Нёман у Гродне, пойменная тэрыторыя ў даліне р.Мухавец у Брэсце), у непасрэднай блізасці ад якога часта знаходзяцца паркавыя тэрыторыі (паркі Паскевіча у Гомелі, «Падніколле» ў Магілёве, «Пышкі» у Гродне і інш.). Паступовае пашырэнне гарадскіх межаў выклікала неабходнасць далейшай арганізацыі транспартных камунікацый; інтэнсіўнымі тэмпамі пачала здзяйсняцца забудова новых тэрыторый. Асноўным пытаннем стала стварэнне архітэктурных ансамбляў з высокімі мастацка-эстэтычнымі якасцямі, у вырашэнні якога найбольшае значэнне атрымалі прынцыпы выяўлення акцэнтаў і дамінант у кампазіцыі, стварэння дынамічных кампазіцый за кошт ужывання разнастайных тыпаў пабудоў, сінтэзу з манументальным мастацтвам і каларыстыка, сінтэзу архітэктурнага і прыроднага асяроддзя.

Структурная арганізацыя тэрыторыі гарадоў характарызуецца актыўным мікрараённым будаўніцтвам, якое паступова зніжае свае тэмпы у 1990-х гг. Значна ўзбуйняецца планіровачная структура гарадоў. Забудова новых раёнаў здзяйсняецца пад уплывам прыродна-ландшафтных умоў і сістэмы транспартных камунікацый, якія рэгламентуюць парадак размяшчэння пабудоў (жылыя раёны Зялёны Луг, Усход, Чыжоўка, Серабранка, Курасоўшчына, Уручча, Вяснінка у Мінску, Фарты, Румлёва у Гродне, Паўднёвы Захад у Брэсце, Поўдзень, Пескаватік у Віцебску, Асаўцы у Гомелі, Юбілейны ў Магілёве і інш.). Нізінныя ўчасткі адводзяцца пад сілуэтную забудову, узгоркі – пад вышыннае будаўніцтва. Паступова ўскладняецца аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя пабудоў новых раёнаў. Разнастайнасць тыпаў дамоў (крыжападобных у плане вышынных будынкаў, крывалінейнай канфігурацыі, вежавага тыпу, гарызантальнага размяшчэння) спрыяе стварэнню выразнага дынамічнага сілуэта забудовы. Актыўным сродкам мастацкай выразнасці з'яўляецца колер, які тактычна ўключаецца ў асобныя часткі пабудоў (тарцы будынкаў, сценавыя панэлі, лоджыі). Забудова фарміруецца па прынцыпу стварэння адкрытых і закрытых прастораў з улікам панарамнага раскрыцця кампазіцыі. Так, узаемасувязь разнастайных фактараў і сродкаў дэкаратыўнай выразнасці спрыяе станаўленню новага, яскравага мастацкага вобраза у беларускім горадабудаўніцтве.